обеспечения качества формирования ценностей и идей гуманизма в возрастосообразном развитии личности.

**Литература**:

1. Богдашкин, М.А. Модели формирования культуры здоровья личности в конструктах гуманизма и возрастосообразности [Текст] / М.А. Богдашкин // Старт в науку : матер. IV Междун. науч.-практич. конфер. студ. и учащ., Орша, 19 мая 2020 г. : в 2 т. / сост.: Е.А. Чикованова, Е.В. Дернова. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2020. – Т. 2. С.103-105.
2. Быкова, А.А. Системность реализации идей и ценностей ответственности личности на основе учета возможности возрастосообразного развития [Текст] / А.А. Быкова, Е.Г. Селиванова, Д.Ю. Чупин // Социальная, профессиональная и персональная ответственность личности в современном обществе : матер. Всеросс. науч.-практ. конфер. с междун. участ. (Омск, 8–10 октября 2020 г.). – Омск : Изд-во Ом. гос. ун-та, 2020. С.463-465.
3. Дибесов, А.А. Фасилитация как модель возрастосообразного упрощения развития личности [Текст] / А.А. Дибесов // Наука и молодежь: проблемы, поиски, решения: тр. Всеросс. научн. конфер. студ., аспир. и молод. учен. (Новокузнецк, 19–21 мая 2020 г.). Вып. 24. Ч.IV. Гуманитарные науки ; под общ. ред. М.В. Темлянцева. – Новокузнецк : Изд. центр СибГИУ, 2020. С.143-147.
4. Котова, А.И. Культуросообразность и возрастосообразность в уточнении моделей самореализации личности через спорт [Текст] / А.И. Котова // Наука и молодежь: проблемы, поиски, решения: тр. Всеросс. научн. конфер. студ., аспир. и молод. учен. (Новокузнецк, 19–21 мая 2020 г.). Вып. 24. Ч.IV. Гуманитарные науки ; под общ. ред. М.В. Темлянцева. – Новокузнецк : Изд. центр СибГИУ, 2020. С.218-221.
5. Пелих, О.С. Популяризация возрастосообразной продуктивности развития и становления личности в современной системе непрерывного образования [Текст] / О.С. Пелих, Е.А. Рудофилова, Е.Н. Щербакова // Актуальные вопросы социальных и гуманитарных наук в инновационном развитии : матер. Междун. науч.-практич. конфер. (Джизак, 20 ноября 2020 г., Узбекистан). – Джизак, 2020. С.527-530.

## МАТЫЎ ШЛЯХУ Ў ПАЭЗІІ І. РАДЗІХОЎСКАЙ

***Падстаўленка Д.В.***
*вучань 9 "А" класа ДУА "Сярэдняя школа № 23 г. Віцебска"*
Навуковы кіраўнік – Падстаўленка С.У., настаўніца беларускай мовы і літаратуры

**Уводзіны.** У сусветнай літаратуры, пачынаючы ад народных казак і да філасофскіх трактатаў, матыў шляху асэнсоўваецца шматварыянтна. З даўніх часоў творцы і мысляры ўспрымаюць гэты матыў як *жыццёвы шлях* ці *лёс чалавека*. Пры ўсёй агульнасці такога разумення адзначанага матыва кожны з мастакоў слова імкнуўся надаць яму індывідуальнае сэнсавае напаўненне.

Часам і маладыя аўтары апелююць да гэтага "сталага" філасофскага матыва. Свой спектр яго раскрыцця знайшла і беларуская паэтка Ірына Радзіхоўская. У гэтым артыкуле мы вызначым спецыфіку мастацкага асэнсавання матыву шляху ў найбольш яркіх прыкладах з паэзіі І. Радзіхоўскай.

**Асноўная частка артыкула.** Важнасць глыбокага асэнсавання філасофскага матыву шляху прыходзіць да Ірыны Радзіхоўскай рана, аб чым сведчыць яе верш з адпаведнаю назваю "Шлях", надрукаваны ў часопісе "Бярозка" яшчэ ў 2015-м годзе. Няцяжка зразумець, чаму ўзнік такі, як кажуць, верш-прагноз ці верш-прадбачанне, дзе аўтабіяграфічная гераіня-адзінаццацікласніца разважае пра жыццё ў цэлым і пра тое, па якіх яго "сцежках" накіравацца самой.

Вялікі свет бачыцца гераіне твора ў незлічоных фарбах і адценнях. Таму заканамерна, што, жадаючы яго апісаць, І. Радзіхоўская ўжывае шматлікія эпітэты-характарыстыкі. У выніку навакольны свет і *чароўны*, і *займальны*, і *прывабны*, і *неверагодны*, і *смешны*, і *яркі*. Ён яшчэ і *бязмежны*, таму кожны можа скамбінаваць яго па-свойму. Разам з тым, нягледзячы на казачнасць існавання, яго дарогі скіраваныя ў розныя бакі:

"Ці ў неба яснае, без хмар?

Репозиторий ВГУ

Ці да маркотнага парога?” [1, с. 9]

Мудрая ў сваіх высновах лірычная гераіня аб’ектыўна ацэньвае і астатніх людзей, адзначае, што яны могуць быць як высакароднымі стваральнікамі-дабрадзеямі, так і злымі знішчальнікамі мар:

“Неверагодны гэты свет,
Балюча, часам, можа ўдарыць!
І прынцы з домікаў-планет
З усмешкамі зламаюць мары...” [1, с. 9]

Аднак пры ўсіх магчымых расчараваннях свет застаецца па-ранейшаму цікавым і нястрачаным, бо

“Са мной сям’я, сябры і неба!
І ў надыходзячай вясне
З раллі ўзрасце калоссе хлеба!” [1, с.9]

Лірычная гераіня падкрэслівае аднолькавую важнасць родных, сяброў, нябеснай вышыні (як сімвала светлай мары і ідэалу) і хлебных каласоў, што традыцыйна ўвасабляюць само існаванне. Цікава заўважыць, што ў гэтым вершы тройчы паўтораны мастацкі вобраз раллі, які асацыятыўна збліжаецца з цэнтральнымі вобразамі твора: жыццём і светам. Узнікненне гэтай сімвалічнай трыяды грунтуецца на такіх яе характарыстыках, як шырыня, усеагульнасць, вітальная, нараджальная сіла. Відавочна, што адзначаная мастацкая вобразнасць наўпрост паходзіць з адпаведнай традыцыі ў беларускай літаратуры, закладзенай Я. Коласам у паэмах “Новая зямля” і “Сымон-музыка”, У. Караткевічам у рамане “Каласы пад сярпом тваім”.

Матыў шляху пераважае і ў вершы “Я тебя поведу к Мечте”. Дадзены твор напісаны ў спецыфічнай мастацкай форме звароту да сябра. З улікам рамантычнай тыпізацыі і абагульненасці паказаных з’яў названы паэтычны прыклад набывае філасофскую скіраванасць. Лірычная гераіня кліча да спазнання таямніц Сусвету, першароднай прыроднай прыгажосці і моцы стыхій:

“А ещё ты увидишь рассвет,
Ты узнаешь, каков он внутри.
Я открою сакральный секрет
С первым лучиком новой зари.
Я огонь показать смогу –
Его искры живут в сердцах” [2, с. 56].

Гераіня імкнецца дапамагчы адчуць смак свабоды і ўбачыць ідэальнае грамадства “без обмана, без лжи, без потерь” [2, с. 57]. Яна ведае шлях

“… сквозь туман
Лжеулыбок, неискренных лиц” [2, с. 56].

Лірычная гераіня Радзіхоўскай упэўнена ў правільнасці гэтага шляху, бо яго кожны выбірае сам, кіруючыся глыбокай душэўнай неабходнасцю і верай:

“Слушай сердцем, смотри душой,
Верь и знай: твоё Счастье ждёт” [2, с. 57].

Шматзначны матыў веры таксама часта прадвызначае ідэйны змест вершаў І. Радзіхоўскай. Яго варыянтамі становяцца: 1) вера ў сябе, у свой толькі часткова раскрыты маральны, інтэлектуальны і валявы патэнцыял; 2) сяброўская, спагадлівая вера ў іншых людзей, што пакуль асцярожна выбіраюць жыццёвыя арыенціры. Матыў веры раскрываецца ў аналізуемай паэзіі і ў духоўна-філасофскім плане. Прыкладам можа паслужыць верш “Ён верыць, павер і ты”. Паэтка працягвае тут даверлівую і шчырую размову з чытачом пра жыццёвы шлях і светлы пачатак у ім. Такім вытокам радасці і надзеі на лепшае для лірычнай гераіні становіцца Творца, Бог. Варта пагадзіцца, што годна ісці па свеце – справа нялёгкая не толькі для чалавека, але і для Яго. Таму гераіня ўпэўнена,

Рэпазіторый ВДУ

“...што па кроках, асцярожна,
Стварыў аднойчы моцны Творца нас.” [2, с. 10]

З гэтай прычыны вельмі важна кожнаму

“…ісці наперад –
Амаль адзінае, што трэба нам усім.
І неяк жыць так, каб у сэрцы веру
Ў сябе, у лепшае ніхто не загасіў”. [2, с. 10]

У цэнтральнай частцы верша І. Радзіхоўская ўдала раскрывае душэўны стан і ўнутраныя адчуванні чалавека, які страчвае апошнія сілы ў барацьбе з выпрабаваннямі лёсу:

“Калі ў адчаі хочацца памерці,
А грудзі разрывае моцны боль,
І з памяці, як з раны, хочам сцерці
Атрутных успамінаў нашых соль.” [2, с. 12]

І хоць “гэты свет бяздушны і пусты”, але маяком Дабрыні і светачам Надзеі ў ім застаецца Творца, бо ў любой сітуацыі

“Ён табе ціхенечка адкажа:
«Я веру ў цябе. Павер і ты…»” [2, с. 13].

**Заключэнне.** Такім чынам, матыў шляху ў паэзіі Ірыны Радзіхоўскай з’яўляецца важным кампанентам яе мастацка-філасофскай карціны свету. Ён удала звязвае пэўныя аспекты ўласнага лёсу гераіні (у прыватнасці, яе выбар у далейшым дарослым жыцці) з асэнсаваннем кожным чалавекам асабістай светапогляднай пазіцыі. Ужытыя пры гэтым вершаваныя формы разваг з самім сабой ці размовы з чытачом спрыяюць даверлівасці аповеду і эмацыйнай далучанасці да такога паэтычнага тэксту.

**Літаратура:**

1. Радзіхоўская, І. Шлях / І. Радзіхоўская // Бярозка. – 2015. – № 8. – С. 9.
2. Радзіхоўская, І. Ідолта / І. Радзіхоўская. – Мінск: ТАА “Харвест”, 2016. – 64 с.

## ОСОБЕННОСТИ ПОПУЛЯРИЗАЦИИ ПРОДУКТИВНОЙ САМОРЕАЛИЗАЦИИ ЛИЧНОСТИ

***Полубеженцев Ф.П.***
*обучающийся 10 класса МБОУ СОШ № 67, г. Новокузнецк, Российская Федерация*
Научный руководитель – Ливанова Е.С., учитель

Наиболее активно осуждают в обществе основы востребованного развития личности в системе непрерывного образования и профессионально-трудовых отношений.

Практика осмысления возможности создания классически уточняемых и инновационно определяемых продуктов уникальна [1-4].

Новые идеи и новые продукты определяют будущее личности и общества.

Цель работы: изучение, осмысление и теоретизация популяризации продуктивной самореализации личности в системе непрерывного образования.

Основы продуктивности личности и общества представляет собой систему и механизм самоорганизации уровня успешности, востребованности, конкурентоспособности на Мировой арене инновационных и традиционных ресурс гуманистически целесообразных способов постановки и реализации идей развития и управления.

Популярность самореализации обусловлена системной зависимостью личности и общества от создаваемых благ и продуктов возрастосообразного развития личности и общества.



Репозиторий ВГУ